УДК 811.161.3

**А.В. РАГАЎЦОВА**

# НАЗОЎНІКІ З МІФАЛАГІЧНАЙ І РЭЛІГІЙНАЙ СФЕР У ФРАЗЕАЛАГІЗМАХ

*У артыкуле разглядаюцца назоўнікі са сфер міфалогіі і рэлігіі, якія з'яўляюцца кампанентамі фразеалагізмаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Кожная з дэнататыўных сфер ("Рэлігія" і "Міфалогія") падзяляецца на лексічна-семантычныя групы, якія ілюструюцца фразеалагізмамі.*

*Фразеактыўнасць назоўнікаў у цэлым даволі нізкая, аднак ёсць словы (бог, чорт), што маюць высокую фразеалагічную актыўнасць, якой садзейнічаюць такія фактары, як высокая частотнасць слоў у мове, іх мнагазначнасць, стылістычная нейтральнасць, спрадвечнасць паходжання і міфалагічная маркіраванасць.*

## Уводзіны

Міф – першая спроба чалавека растлумачыць з'явы прыроды і грамадскага жыцця. Ідэі пра паходжанне Зямлі і ўсяго жывога, уяўленні аб гераічных учынках і высокіх чалавечых пачуццях адлюстроўваюцца пераважна праз вобразы, рэальныя і нерэальныя. Міфалагічная свядомасць – аснова свядомасці рэлігійнай, менавіта таму міфалогія "часта знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з рэлігіяй" [1, с. 479].

У беларускім мовазнаўстве няма спецыяльных прац, прысвечаных разгляду назоўнікаў, што з'яўляюцца кампанентамі фразеалагізмаў і адносяцца да сфер міфалогіі і рэлігіі. Пэўныя звесткі пра такія назоўнікі можна знайсці ў працах беларускіх лінгвістаў, дзе слова разглядаецца ў розных аспектах: экстралінгвістычны (У.І. Коваль, І.Я. Лепешаў, М.А. Даніловіч і інш.), крыніцы паходжання (А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, А.А. Станкевіч, Т.А. Мальцава і інш.), актыўнасць ужывання (І.Я. Лепешаў, У.В. Анічэнка, С.М. Струкава і інш.).

Мэтай артыкула з'яўляецца разгляд у складзе фразеалагізмаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы назоўнікаў са сфер міфалогіі і рэлігіі.

Задачы артыкула: 1) выявіць лексічна-семантычныя групы назоўнікаў; 2) акрэсліць фактары, ад якіх залежыць ступень фразеаўтваральнай актыўнасці лексікі.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца 48 назоўнікавых кампанентаў, якія ўжываюцца ў 329 фразеалагізмах, узятых з двухтомнага "Слоўніка фразеалагізмаў" І.Я. Лепешава [2].

## Асноўная частка

І. Дэнататыўная сфера "Рэлігія". Яна ўключае 35 назоўнікаў, якія адносяцца да наступных лексічна-семантычных груп.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

1. Назоўнікі, што абазначаюць Бога, звышнатуральных істот, святых як аб'екты рэлігійнага пакланення: *алах – адзін алах ведае* 'нікому невядома', *апостал – зацюканы апостал* 'увогуле някепскі чалавек, якога затуркалі абставіны, жыццё і пад.', *бог – ёсць бог на свеце* 'выказванне задавальнення, радасці з нагоды здзяйснення чаго-н.', *дух – святым духам* 1) 'нічога не еўшы (жыць)', 2) 'нібы само сабой, невядома як (рабіць што-н., робіцца што-н.)', *ойча – як ойча наш* 'вельмі добра, цвёрда (ведаць, запомніць і пад.)', *святы – як святы <турэцкі>* 'нічога не робячы (сядзець)'.

2. Назвы догматаў: *грэх – браць (прымаць) грэх на ‹сваю› душу* 'пастулаючыся сваім сумленнем, перакананнем, рабіць які-н. заганны ўчынак', *дух – дух вон* 'хто-н. памёр (часцей раптоўна, імгненна)', *душа – ледзь (ледзьве) душа ў целе* 'хто-н. вельмі слабы, чуць жывы', *пекла – з пекла родам* 'люты, бесчалавечны, бязлітасны', *рай – зямны рай* 'незвычайна прыгожая мясціна, дзе можна шчасліва і бесклапотна жыць'.

3. Назвы людзей, якія маюць службовае дачыненне да рэлігіі: *ксёндз – як ксёндз Магдусі* 'вельмі добра (дагадзіць каму-н.)', *манах – ну яго (яе, іх) к манахам* 'выказванне незадавальнення, прыкрасці, адмаўлення, нежадання рабіць што-н.', *папа – свяцейшы за папу рымскага* 'такі, што занадта строга прытрымліваецца пэўных ідэалаў, правілаў, установак і пад.', *поп – дурны поп хрысціў* 'хто-н. тупы, неразумны ці наіўны, нездагадлівы', *праведнік – сном праведніка* 'вельмі моцна (спаць, заснуць)'.

4. Назвы рэлігійных твораў і тэкстаў: *біблія – як (што) баран у бібліі* 'зусім нічога не (разбірацца, разумець)', *малітва – тваімі (вашымі) малітвамі* 'жартоўны адказ удзячнасці на пытанне пра здароўе, удачу, справы і пад.', *пацеры – гавары з чортам (з п'яным) пацеры* – 'выказванне абурэння, незадавальнення тым, з кім немагчыма весці размову, ніяк нельга дамовіцца', *святцы – забіць у званы не паглядзеўшы ў святцы* 'распачаць што-н. недарэчы, не разабраўшыся ў чым-н.'.

5. Назвы абрадаў: *абедня – сапсаваць ‹усю› абедню* 'нашкодзіць каму-н., парушыць чые-н. планы, справы, намеры', *дух* у значэнні 'споведзь, раскаянне ў грахах' – *як на духу* 'вельмі шчыра, нічога не ўтойваючы (гаварыць, прызнавацца, расказваць, выкладваць і пад.)', *пакаянне – адпусці (-це) душу на пакаянне* 'пашкадуй, злітуйся', *споведзь – як (нібы) на споведзі* 'вельмі шчыра, нічога не ўтойваючы (гаварыць, расказваць, прызнавацца і пад.)'.

6. Назвы свят: *каляды – да грэчаскіх каляд (календаў)* 'на няпэўны час, надоўга ці назаўсёды (адкладваць, адкласці)'.

7. Назвы культавых збудаванняў: *алтар – класціся на алтар* 'аддавацца чаму-н. у імя чагосьці высокага, дарагога і пад.', *званіца – бачыць са сваёй званіцы* 'ацэньваць што-н. аднабакова, толькі са сваіх пазіцый'. Назоўнік *манастыр* у фразеалагізме *лезці са сваім статутам у чужы манастыр* 'умешвацца ў чужыя справы, навязваючы каму-н. свае рашэнні, думкі, погляды і пад.' ужыты ў сінкрэтычным значэнні 'храм-абшчына'.

8. Назвы прадметаў і рэчываў, якія выкарыстоўваюцца пры абрадах: *ікона – хоць ікону пішы (малюй)* 'хто-н. вельмі добры ва ўсіх адносінах', *кадзіла – раздзьмухваць (раздзьмуць) кадзіла* 'падымаць шум вакол якой-н. справы, учынку і пад.', *крыж – як з крыжа зняты (-ая, -ае, -ыя)* 'вельмі слабы, даведзены да знямогі', *ладан – як чорт ад ладану* 'ўсімі сродкамі, як толькі можна (пазбаўляцца, адмахвацца, уцякаць і пад. ад каго-, чаго-н.)', *міра – адным (тым жа) мірам мазаны* 'вельмі падобныя адзін на аднаго ў якіх-н. адносінах; адзін не лепшы за другога; з аднолькавымі недахопамі', *ружанец – і да танца і да ружанца* 'пасвяточнаму, у вольны ад работы час', *святыя* у значэнні 'абразы' – *хоць святых*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*вынось* ‘няма сіл цярпець што-н.; нязносна, нясцерпна для іншых’, *фіміям – курэнне фіміяму* ‘надзвычайнае ўзвялічванне, ліслівае праслаўленне каго-н.’.

Фразеалагічная актыўнасць назоўнікаў, што абазначаюць рэаліі рэлігійнага жыцця, у цэлым даволі нізкая. Так, 74% назоўнікаў сустракаюцца ў асобных выразах: у адным фразеалагізме ўжываецца кожны з 16 назоўнікаў (*апостал, біблія, ікона, каляды, ксёндз, малітва, манах, міра, ойча, пакаянне, папа, пацеры, праведнік, святы, святыя, споведзь*), у двух – кожны з 9 (*абедня, алтар, званіца, кадзіла, манастыр, рай, ружанец, святцы, фіміям*), у трох фразеалагізмах – назоўнік *ладан*. Дзевяць назоўнікаў ужываюцца ў чатырох і болей фразеалагізмах: у 4 выразах – назоўнікі *пекла* і *поп*, у 5 – *крыж*, у 7 – *алах*, у 9 – *грэх*, у 15 – *божа*, у 16 – *дух*, у 20 – *душа*, у 97 – *бог*.

Як сведчаць лічбавыя паказчыкі, назоўнік *бог* мае самую высокую фразеактыўнасць, крыху меншую – назоўнікі *душа* і *дух* у значэнні ‘бессмяротная нематэрыяльная першааснова ў чалавеку’. Актыўнасці спрыяюць такія фактары, як полісемія, стылістычная нейтральнасць, спрадвечнасць паходжання і частотнасць слоў. Дарэчы, гэтыя назоўнікі ўваходзяць у тысячу самых высокачастотных лексічных адзінак у беларускай мове (*душа* – 152, *бог* – 128, *дух* – 37[1]). Актыўнае ўжыванне слова *бог* у фразеалагізмах абумоўліваецца таксама і экстралінгвістычным фактарам. Вядома, што Бог – “творца неба і зямлі, пачатак адвечны, духоўны і бесцялесны” [4, с. 48]. Ён з’яўляецца ўвасабленнем справядлівасці, дапамагае ў добрых справах і карае за дрэнныя: *бог паслаў* ‘пашчасліваіла займець’, *бог пакараў* ‘хто-н. нешчаслівы, трапіў у цяжкае становішча’, *бог суддзя* 1) ‘хто-н. паплаціцца за свае нядобрыя справы’, 2) ‘няхай гэта будзе на чыім-н. сумленні як яго маральная адказнасць за нядобры ўчынак’, *і бог вялеў* ‘хто-н. мае неаспрэчнае права на што-н., варты, заслугоўвае чаго-н.’ і г. д. Сярод фразеалагізмаў з кампанентам *бог* сустракаецца многа выразаў – зваротаў да Усявышняга з пажаданнямі: чаго-н. – *дай бог ( божа)* каму; успомніць што-н. – *дай бог (божа) памяць*; каб абяцанае здзейснілася – *дай бог (божа) чутае бачыць*; поспеху, удачы ў працы, у якой-н. справе – *памагай бог*; і інш.

Адначасова ў фразеалагізмах адлюстроўваецца і ўяўленне аб чалавечым абліччы Бога, што пацвярджаецца наяўнасцю ў іх саматызмаў: *як у бога за плячыма* ‘спакойна і ў поўнай бяспецы (быць, знаходзіцца, сядзець і пад.)’, *каб (калі б)* чые *словы ды богу ў вушы* ‘выказванне пажадання, каб збылося тое, пра што сказаў субяседнік’. Бог у народнай традыцыі “звычайна ўяўляецца ў выглядзе сівога барадатага старога” [4, с. 49], што відаць з фразеалагізма *браць (хапаць) бога за бараду* ‘дасягаць вяршынь беззаганнасці, бездакорнасці’.

ІІ. Дэнататыўная сфера “Міфалогія”. Яна ўключае 13 назоўнікаў, якія падзяляюцца на дзве лексічна-семантычныя групы.

1. Назвы звышнатуральных істот: *геній – добры геній* ‘чалавек, які аказвае на каго-н. дабратворны ўплыў, прыносіць каму-н. карысць’, *джын – выпускаць (выпусціць) злога джына* ‘выклікаць які-н. непрыемны неабарачальны працэс, рабіць што-н. неспадзяванае, рызыкоўнае’, *д’ябал – да д’ябла* 1) ‘прэч (ісці, пайсці, гнаць, выганяць і пад.)’, 2) ‘ушчэнт, прахам (ляцець, ісці)’, 3) ‘навошта, дзеля чаго’, 4) ‘выказванне іранічных адносін да каго-, чаго-н.’, *кадук – кадук не бярэ (не возьме)* ‘нічога не здараецца, не робіцца з кім-н., не шкодзіць каму-н.’, *ляд – на які ляд* ‘навошта, для чаго’, *нячысцік – нячысцік носіць* ‘хто-н. недарэчы ходзіць, бадзяецца дзе-н.’, *фенікс – як (як быццам) фенікс з попелу (з прыску)* ‘нібы сімвал неўміручасці, вечнага абнаўлення, адраджэння’, *чорт – чорту рогі скруціць*

[1] Тут і далей частотнасць назоўнікаў падаецца паводле “Частотнага слоўніка беларускай мовы: Мастацкая проза” [3].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

пры абрадах (23%), а таксама тыя, што абазначаюць Бога, звышнатуральных істот, святых як аб'екты рэлігійнага пакланення (17%). Фразеалагічная актыўнасць назоўнікаў у цэлым даволі нізкая: толькі 27% іх ужываецца ў 4 і болей выразах. Больш высокай фразеактыўнасці назоўнікаў спрыяюць такія фактары, як іх мнагазначнасць, стылістычная нейтральнасць, частотнасць і спрадвечнасць паходжання. На актыўнасць ужывання назоўнікаў пры ўтварэнні фразеалагізмаў уплывае і экстралінгвістычны фактар.

*ЛІТАРАТУРА*


1. ***Дабрынін, М.А.*** Міфалогія / М.М. Дабрынін, У.А. Замкавец // Беларус. энцыкл.: у 18 т. – Мінск, 2000. – Т.10. – С. 479.
2. ***Лепешаў, І.Я.*** Слоўнік фразеалагізмаў: у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск.: БелЭн. імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1. – 672 с.; Т. 2. – 704 с.
3. ***Мажэйка, Н.С.*** Частотны слоўнік беларускай мовы: Мастацкая проза / Н.С. Мажэйка, А.Я. Супрун. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1976. – 232 с.
4. ***Зайкоўскі, Э.*** Бог / Э. Зайкоўскі, У. Лобач // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік. – Мінск, 2004. – С. 48-49.
5. ***Коваль, У.І.*** Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У.І. Коваль. – Гомель, 1995. – 180 с.
6. ***Салавей, Л.М.*** Кадук / Л.М. Салавей // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск, 2006. – Т. 1. – С. 596.
7. ***Лепешаў, І.Я.*** Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск.: БелЭн, 2004. – 448 с.
8. ***Мокиенко, В.М.*** Образы русской речи: Историко-этимологические и этнолингвистические очерки фразеологии / В.М. Мокиенко. – Л.: Изд-во Ленингр. ун-та, 1986. – 280 с.


Паступіў у рэдакцыю 02.04.2009 г.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова